ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК “Гродзенская
абласная навуковая бібліятэка
імя Я.Ф.Карскага”
М. Э. Ігнатовіч
“ “ _______________2024 г.

**Інструкцыя**
**аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу**
**“ЛЕТА І КНІГА – 2024” “З кнігай – у лета!”**

1. Конкурс “Лета і кніга – 2024” (далей – Конкурс) праводзіцца дзіцячым аддзелам ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

2. Асноўная мэта Конкурсу – прыцягненне дзяцей да чытання ў летні перыяд, уключэнне іх у творчую дзейнасць, арганізацыя вольнага часу.

3. Конкурс праводзіцца ў перыяд з 1 чэрвеня да 31 жніўня 2024 года.

4. У Конкурсе прымаюць удзел навучэнцы агульнаадукацыйных школ г. Гродна, дашкольнікі і іх бацькі.

5. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- **“СУПЕРчытач”** *(узнагароджваюцца ўдзельнікі, якія прачыталі найбольшую колькасць кніг у летні перыяд)*;
- **“Самы юны чытач”** *(вызначаюцца актыўныя чытачы самага маленькага ўзросту, якія прачыталі найбольшую колькасць кніг у летні перыяд);*
- **“Падлеткі чытаюць!”** *(узнагароджваюцца ўдзельнікі ўзроставай катэгорыі 11-15 гадоў, якія прачытаюць найбольшую колькасць кніг у летні перыяд);*
- **“Чытаю я — чытае ўся мая сям’я”** *(пераможцы вызначаюцца па сумарнай колькасці прачытаных сям'ёй кніг: мамай, татам, сёстрамі і братамі)*;
- **“Аматар пазнавальнай літаратуры”** *(вызначаецца ўдзельнік Конкурсу, які аддаваў перавагу пазнавальнай літаратуры);*
- **“Чытаю беларускае”** (*вызначаецца чытач-рэкардсмен па колькасці прачытаных у летні перыяд кніг на беларускай мове);*
- **“Кніжны ІНСТАрэпарцёр”** *(вызначаецца ўдзельнік*

*Конкурсу, які садзейнічаў папулярызацыі Конкурса праз сацыяльную сетку Інстаграм: размяшчаў у сябе на старонцы ў сацыяльнай сетцы Інстаграм свой фотаздымак з кнігамі і адзначаў: #летоикнига2024, @detskiy_book_center, @grodnolib).*

6. У межах Конкурсу неабходна:

- прачытаць у перыяд летніх канікул не менш 30-ці кніг;
- падрыхтаваць (па жаданні) творчую працу (*малюнак (аплікацыю, калаж) у любой тэхніцы па прачытаных кнігах, фармат А3 ці А4)*.

7. Для падвядзення вынікаў Конкурсу складаецца журы (Дадатак 1).

8. Вынікі Конкурсу падводзяцца на пасяджэнні журы да 12 верасня 2024 года.

9. Па выніках Конкурсу журы вызначае па 3 пераможцы ў намінацыях “СУПЕРчытач”, “Самы юны чытач”, “Падлеткі чытаюць!”, “Чытаю я — чытае ўся мая сям’я” па колькасці прачытаных кніг; па 1 пераможцу вызначаецца ў намінацыях “Самы юны чытач”, “Чытаю беларускае”, “Кніжны ІНСТАрэпарцёр”.

10. Журы пакідае за сабой права не прысуджаць узнагароды пры адсутнасці ўдзельнікаў.

11. Пераможцы Конкурсу ў кожнай намінацыі ўзнагароджваюцца дыпломамі і падарункамі.

12. Узнагароджанне пераможцаў Конкурсу адбудзецца ў верасні 2024 года, падчас святкавання Дня бібліятэк Рэспублікі Беларусь.

13. Вынікі Конкурсу размяшчаюцца на сайце ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

14. Фінансаванне Конкурсу (выраб дыпломаў, набыццё падарункаў) ажыццяўляецца за кошт пазабюджетных сродкаў у частцы сум перавырашэння даходаў над расходамі ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.

**Дадатак 1**

**ЖУРЫ**

конкурсу “Лета і кніга – 2024”

1. Давыдзік Надзея Сяргееўна, намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, старшыня журы;

2. Арлюк Святлана Аляксандраўна, загадчык дзіцячага аддзела ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, намеснік старшыні журы;

3. Рамук Алена Браніславаўна, бібліятэкар ІІ катэгорыі групы па арганізацыі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій дзіцячага аддзела ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”, сакратар журы;

4. Герасімчук Дзіяна Юр’еўна, бібліятэкар дзіцячага аддзела ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

5. Кашлей Рэгіна Іосіфаўна, бібліятэкар І катэгорыі дзіцячага аддзела ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

6. Сянчыла Ілона Алегаўна, бібліятэкар І катэгорыі дзіцячага аддзела ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”;

7. Юркавец Лідзія Леанідаўна, бібліятэкар ІІ катэгорыі дзіцячага аддзела ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”.